**ПАДЗЕЯ**

# КУФЭРАК ДОБРЫХ ТРАДЫЦЫЙ



**Дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі наведала Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей. Штогод у снежні ў гэтым каларытным месцы, напоўненым духам беларускасці, ладзіцца літаратурная гасцёўня, удзельнікамі якой паспелі стаць нямала літаратараў Прынёмання. 5 снежня адзіны ў Беларусі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей па традыцыі прымаў гасцей.**

Заснаваны ў 1968 годзе школьным настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Алесем Мікалаевічам Белакозам музей знаходзіцца ў аграгарадку Гудзевічы (Мастоўскі раён, Гродзенская вобласць) і з'яўляецца ўнікальным па сваім фармаце: беларуская літаратура, народнае ткацтва плюс этнаграфія. Пачыналася ўсё са школьнага літаратурнага гуртка, якім кіраваў А. М. Белакоз. Сёння плошчы музейных экспазіцый захоўваюць дух нацыянальных вытокаў, непаўторны каларыт народнай творчасці беларусаў, традыцыі якой жывуць у стагоддзях і перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Экспазіцыю музея складаюць асабістыя рэчы выбітных творцаў, класікаў айчыннай літаратуры, рэдкія выданні кніг, карціны беларускіх мастакоў. Дзякуючы жонцы Алеся Мікалаевіча Веры Ігнатаўне ўнікальная тэхналогія падвойнага ткацтва ўнесена ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як нацыянальная каштоўнасць. У сценах гэтых пакояў лунае жывы дух часу – чароўная крыніца натхнення, што злучае мінулае і дзень сённяшні, багатыя традыцыі і смелы позірк у будучыню.

Можна з упэўненасцю сказаць, што калектыў музея і Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі знаходзяцца ў сяброўскіх стасунках. Выступіць тут перад аматарамі літаратуры, ветэранамі педагагічнай працы, ра-

ботнікамі культуры і сельскай гаспадаркі лічыцца прэстыжным. Для сённяшніх пісьменнікаў гэта свайго роду тэст на народнасць, нацыянальную сталасць, блізасць да каранёў. У маі бягучага года Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей прымаў удзельнікаў першага Рэспубліканскага фестывалю паэзіі «Масты сугучнасці». Літаратурныя маршруты ніколі не абмінаюць гэтае месца. У снежаньскай літгасцёўні перад аматарамі літаратуры Мастоўскага краю выступілі: Людміла Кебіч, паэтэса, празаік, перакладчык, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь; Дзмітрый Радзівончык, паэт, публіцыст; Мікалай Іваноўскі, паэт, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, а таксама маладыя аўтары – паэтэса Вольга Алізар і паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін.

Прадставіла членаў дэлегацыі Людміла Антонаўна Кебіч. …Дзмітрый Радзівончык прысвяціў сваё выступленне (эсэ, верш) вобразу паэта Максіма Багдановіча і 133-й гадавіне з дня нараджэння самага маладога класіка айчыннай літаратуры. …Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён) прэзентаваў свой зборнік лірыкі «Адгалоскі саракавых» (Мінск, «Ковчег», 2024), прадэкламаваў творы філасофска-патрыятычнай і грамадзянскай лірыкі. …Андрэй Дарожкін выступіў з паэзіяй на розныя тэмы, асноўнымі з якіх былі юбілеі гістарычных падзей – 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. …Людміла Кебіч прэзентавала сваю новую кнігу прозы для падлеткаў «Чароўны куфэрак часу» (Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2024) і прачытала адно з апавяданняў. Дарэчы, у кнізе Людмілы Антонаўны гаворыцца менавіта пра Гудзевічы, а прататып чароўнага куфэрка часу – рэальны куфар з экспазіцыі музея. …Самым багатым на эмоцыі атрымалася



выступленне паэтэсы Вольгі Алізар, якая вершамі пра сваіх бацькоў і сваіх дзяцей здолела літаральна выклікаць слёзы на вачах прысутных і запаліць усмешкі на тварах. А яшчэ Вольга падарыла музею лірычнае прысвячэнне Гудзевічам і прыгожы вышываны рушнік уласнага выканання *(на фота).*



Трэба адзначыць, што атмасфера ў літаратурнай гасцёўні панавала вельмі ўзнёслая і па-сяброўску добразычлівая. Гучалі апладысменты, задаваліся пытанні гасцям. Па традыцыі пісьменнікі падарылі музею свае кнігі. Калі падводзіць вынікі сустрэчы, варта адзначыць важнасць наведвання творчымі людзьмі такіх месцаў. Важна бываць тут усім, для каго паняцце «патрыятызм» – не пусты гук. Невыпадкова імя Алеся Белакоза (1928-2016), заснавальніка Дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея ў Гудзевічах вядома далёка за межамі Гродзенскай вобласці. Тэмы міру і згоды, любові да роднай зямлі і чалавека, сямейных каштоўнасцяў і народных традыцый, повязі часоў і пераемнасці пакаленняў – такі ідэйны змест прагучаўшых прамоў і літаратурных тэкстаў.

Скончылася мерапрыемства таксама традыцыйна – экскурсіяй па музеі, сяброўскім чаяваннем і фатаграфаваннем на памяць аб сустрэчы. Зразумела, жыццё складаецца з сустрэч і расставанняў. Колькі іх было і будзе яшчэ! Але ў гэты снежаньскі вечар мы выразна адчулі, як у сэрцы кожнага з нас адбываецца нешта надзвычай важнае.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** незабыўныя эпізоды наведвання Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея дэлегацыяй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Снежань 2024 года.


Неба
ў дыяментах
DARIDA




Нашчадкі роду Іваноўскіх
Пяром і сэрцам
Адгалоскі саракавых...


Мае начныя бліскавіцы
Нашчадкі роду Іваноўскіх
Пяром і сэрцам
Адгалоскі саракавых...


Мае начныя бліскавіцы
Пяром і сэрцам
Адгалоскі саракавых...







**Пісьменнікі і дырэктар установы культуры Таццяна Вітальеўна Прудзілка**


НАГА ЛІТАРАТУРНАГА ГУРТКА ДА ДЗЯРЖАЎ
АЛЕСЬ МІКАЛАЕВІЧ БЕЛАКОЗ
Мастак В.Целеш. 1997 г.
ALJES MIKALAEVICH BELAKOZ
Artist - V.Tselesh, 1997.
1965 год – створаны літаратурны гурток у Гудзевіцкай сярэдняй школе
1968 год – адкрыты школьны літаратурна-краязнаўчы музей
1990 год – музею нададзены статус дзяржаўнага і назва “Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей”


А.М.БЕЛАКОЗ
Настаўнік Гудзевіцкай сярэдняй школы, кіраўнік літаратурнага гуртка, стваральнік школьнага музея, дырэктар Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея
A.M.BELAKOZ
Teacher at the Hudzevichy high school, head of the literary club, founder of the school museum, director of the Hudzevichy State Museum of Literature and Local History


FRANCISCUS SKORYNA DE POLOCKO
ФРАНЦЫСК СКАРЫНА
Фрагмент фрэскі Джыакома даль Форна ў Падуанскім універсітэце, дзе ў 1512 годзе Скарына атрымаў ступень доктара медыцыны.


Москва


МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
MAKSIM BAHDANOVICH


ВЯНОК.


CABINET PORTRAIT
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ
(1840 – 1900)
Паэт, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, ідэолаг беларускага нацыянальнага адраджэння.
Фота канца XIX ст.
FRANTSISHAK BAHUSHEVICH
(1840 – 1900)
Poet, one of the founders of the new Belarusian literature, ideologist of the Belarusian national resurgence.
Picture dated late XIX century.


Вольная Беларусь
HOMAN
BIEŁARUS
Наша Доля
БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ
Менск. Беларуская бібліятэка. 1918 год
Пасля адмены ў 1905 годзе забароны на беларускамоўнае кнігадрукаванне актывізавалася беларуская выдавецкая справа


ВАСІЛЬ БЫКАЎ
(Васіль Уладзіміравіч)
(1924–2003)
Празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч.
Народны пісьменнік Беларусі (1980).
Герой Сацыялістычнай Працы (1984).
Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1974), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1978), Ленінскай прэміі (1986)
VASIL BYKAU
(Vasil Uladzimiravich)
(1924–2003)
Novelist, playwriter, publicist, public figure.
Belarusian National writer (1980).
Hero of socialist labor (1984).
Winner of the USSR State Prize (1974), Belarusian State Prize (1978), Lenin Peace Prize (1986)


Міхась Лынькоў МІКОЛКА-ПАРАВОЗ
УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ • ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ
ПЛАЧ ПЕРАПЁЛКІ
ВАЗЬМУ ТВОЙ БОЛЬ
ІВАН ШАМЯКІН
Дзень паэзіі '80
Сяргей Грахоўскі
Бібліятэка беларускай прозы
Арсень Ліс ЦЯЖКАЯ ДАРОГА СВАБОДЫ
васіль вітка урокі
Іван Навуменка
Бібліятэка беларускай прозы
МІКОЛА ЛОБАН
НІЛ ГІЛЕВІЧ ВЫБРАНАЕ
МАКСІМ ТАНК
ІВАН МЕЛЕЖ
Кнігі беларускіх пісьменнікаў з дарункавымі надпісамі музею
Books by Belarusian writers with gift by-lines for the museum


Васіль Быкаў
Янка Брыль
ПАРАСТАК


БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТАРЫ XX – XXI СТАГОДДЗЯЎ





**На экскурсіі**





**Сучаснай моладзі вельмі цікава і карысна наведваць такія мясціны**





**У калекцыі музея экспануюцца дываны, якім пад сотню гадоў**




ПР.ГУ ДЕВ.ЦЕРКВИ.1932.Г.



**У гэты снежаньскі вечар мы адчулі, як у сэрцы кожнага з нас адбываецца нешта важнае.**



**Вось ён, чароўны куфар добрых традыцый...**




**Падвойнае ткацтва. Творы Веры Ігнатаўны Белакоз**

